# РЭСУРСНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

***Здановіч Н.І., Враб'ёва В.А.***
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Мінск*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

Своеасаблівым маркерам гуманізацыі культуры і яе сацыяльнай паспяховасці, на думку навукоўцаў, з'яўляюцца адносіны да спадчыны [5, с. 418] – матэрыяльнай і духоўнай. Фальклор, народныя промыслы і рамёствы з'яўляюцца «нацыянальным рэсурсам культуры» [4, с. 406]. Задача кожнай нацыі – перадаць новаму пакаленню комплекс элементаў сваёй культуры, неабходны для яго паўнавартаснай грамадскай і прафесійнай дзейнасці.

Праблема беларускай нацыі – «размыванне» этнакультурнай ідэнтычнасці [4, с. 406]. Найбольш аптымальны шлях фарміравання этнакультурнай ідэнтыфікацыі беларусаў, што з'яўляецца асновай нацыянальнай ідэнтыфікацыі, – вывучэнне беларускай культуры, якая найбольш яскрава адлюстроўвае самабытнасць нашага народа. Гэта задача павінна вырашацца праз сістэму адукацыйна-выхаваўчых мерапрыемстваў як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе.

Ідэя захавання ніткі Памяці лягла ў аснову нашага праекта распрацоўкі сістэмы кананічных мерапрыемстваў, якія б ахоплівалі найбольш важныя традыцыйныя святы і адначасова стасаваліся з раскладам вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе.

Мэта распрацаваных мерапрыемстваў – пашырэнне ведаў студэнтаў пра народныя святы, знаёмства іх з абрадамі восеньскага, зімовага і веснавога цыклаў, выхаванне праз іх пачуцця павагі і пашаны да народнай спадчыны, гонару за нашых таленавітых продкаў.

Мерапрыемствы прысвечаны тром галоўным святам гадавога цыклу, тэрміны якіх укладаюцца ў межы навучальнага года: гэта «Багач», «Каляды» і «Гуканне вясны». Упершыню падобныя святы былі арганізаваны на факультэтах прыродазнаўства і беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя Максіма Танка [2]. Гэты вопыт быў выкарыстаны на лесагаспадарчым факультэце БДТУ выкладчыкамі кафедры турызму і прыродакарыстання, паколькі нематэрыяльная, як і прыродная, спадчына з'яўляюцца важнейшым рэсурсным патэнцыялам у тым ліку і экскурсійна-турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Адрозніваюцца святы як формай, так і месцам «тэатральнага дзеяння». У аснову сцэнарыя святаў былі пакладзены асноўныя ідэі і максімальна набліжаныя да традыцыйных месцы дзеяння, на якіх базіраваліся народныя святы.

**«Багач»**

Кожны год у глухую восень моладзь разам з усімі трымала своеасаблівы экзамен на ўмельства і сталасць, збіраючы восеньскі ўраджай і дэманструючы набыткі падчас свята «Багач».

У народнай традыцыі свята «Багач» адзначалася 8 (21) верасня і сімвалізавала заканчэнне ўборкі зерневых культур. У хрысціянскай традыцыі гэты дзень звязаны з нараджэннем дзевы Марыі, Багародзіцы. З асноўным атрыбутам свята сявенькай (напоўненай зернем плеценай ёмістасцю), у якую ўстаўлена свечка, вяскоўцы абыходзілі кожную хату, спяваючы райковыя (спарышовыя) песні, імітуючы тым самым прыход да кожнай сядзібы гаспадарчага плёну, што выразна відаць з радкоў:

Ідзі, Раёк, у мой дварок.
У мяне сталы пазасціланыя,
У мяне кубкі паналіваныя [2, с. 316].

Аднак цэнтрам урачыстасці была хата таго гаспадара, у якога сявенька захоўвалася да наступнага года. З яго ж пачынаўся абыход двароў у наступным годзе. Ідэя свята – падсумоўванне вынікаў гаспадарчага года і іх ацэнка.

Месцам дзеяння сучаснага дзейства абіраецца факультэт. Гаспадарам уручаюцца сімвалы свята – сноп, вянок з жытніх каласкоў, сявенька і бохан хлеба. Тугі сноп – гэта і ёсць факультэт, які складаецца з мноства асобных каласкоў, выкладчыкаў і студэнтаў, аб'яднаных адной мэтай – імкненнем да ведаў. Вянок сімвалізуе творчы пачатак, ён звычайна ўпрыгожваецца восеньскімі дарамі (гронкамі рабіны, кветкамі). Сявенька з зернем атаясамліваецца з навуковымі набыткамі, якія ўмацоўваюць факультэт. Хлеб – дабрабыт факультэта, яго гасціннасць і адкрытасць. Падчас свята агучваюцца навуковыя, вучэбныя, творчыя вынікі – паказваецца той узровень дасягненняў, з якога пачынаецца новы навучальны год, і прагназуецца далейшая дзейнасць. У канву свята арганічна ўплятаюцца карагоды, вершы пра восень і ўраджай, а таксама творчыя конкурсы, студэнцкія праекты [2].

Зачараваныя музыкай «Старога Ольсы» і бесперапынным ходам тэатральнага дзейства, студэнты з цікавасцю назіралі за тым, як змянялі адзін аднаго сімвалы свята «Багач». Гэта свята – цудоўная магчымасць кіраўніцтву ўстановы ўзнагародзіць студэнтаў па выніках навучальнага года па самых розных намінацыях: вучоба, навука, творчасць. Сімвалы свята на завяршэнне былі перанесены ў створаны намаганнямі студэнтаў музей, што размясціўся ў шафах вучэбнай аўдыторыі – для захоўвання да будучай восені. Тэрмін правядзення свята – не пазней за Пакровы, якія завяршаюць восеньскі цыкл традыцыйных святаў.

Мерапрыемства рыхтавалася намаганнямі студэнтаў 1-2 курсаў у межах вучэбнай дысцыпліны «Этнаграфічныя рэсурсы турызму».

**«Каляды»**

Свята «Каляды» прыпадае на завяршэнне 1 семестра. У параўнанні з «Багачом» гэта больш дынамічнае свята, паколькі калядоўшчыкі пераходзяць з хаты ў хату, прыносячы ўсім светлую вестку пра паварот сонца на лета, што ўспрымалася як нараджэнне сонца, а ў хрысціянскай традыцыі – нараджэнне Хрыста.

Паводле канцэпцыі свята ўніверсітэт ператвараецца ў вялікае паселішча, а аўдыторыі і памяшканні разнастайных структурных падраздзяленняў – у асобныя «дамы-гаспадаркі». Студэнты-калядоўшчыкі ў адзін з дзён пасля 25 снежня ходзяць з каляднымі зычэннямі па кафедрах, дэканатах, аддзелах універсітэта і вучэбных аудыторыях. Гэта дае магчымасць ахапіць вялікую колькасць гледачоў, уключаючы і студэнтаў-замежнікаў.

У кожнай наступнай аўдыторыі нанава разгортваецца тэатральнае дзейства, галоўным персанажам якога з'яўляецца каза. Каза ў традыцыйнай культуры атаясамліваецца з багаццем і дабрабытам. Таму прыход калядоўшчыкаў з «казой» – гуртоўцам, апранутым у вывернуты кажух і ў масцы казы – у традыцыйным асяроддзі абуджаў надзею на добры ўраджай у новым годзе, а ў студэнцкай аўдыторыі сімвалізуе поспех і дабрабыт. Падмацоўвае гэту ідэю імправізаваны танец казы пад рытуальную песню-замаўленне:

Дзе каза паходзіць,
Там жыта зародзіць,
Дзе каза топ-топ,
Там жыта сем коп [6, с. 85].

Падчас свята ўслаўляецца ўся сям'я: гаспадар, гаспадыня, іх дзеці і бацькі, у студэнцкай аўдыторыі – гэта студэнцкая «сям'я»: кіраўніцтва кафедры, факультэта, куратар, стараста групы і іх «дзеці». Народныя песні свята, у якіх падкрэсліваюцца самыя лепшыя чалавечыя якасці (дабрыня, справядлівасць, гасціннасць, рахманасць, павагажлівасць і інш.) ствараюць атмасферу цеплыні і даверу:

Добры вечар добрым людзям!
А ў етым даму сам пан гаспадар,
Сам пан гаспадар да й на покуце,
Дай на покуце ўвесь у золаце,
Шчодры вечар добрым людзям! [1, с. 96].

Мэта свята – перадаць пачуццё злучанасці, адзінства, стварыць атмасферу шчырасці і ўзаемапавагі адзін да аднаго, зняць псіхалагічныя бар'еры. У кожнай «хаце» свята заканчваецца агульнымі скокамі,

пажаданнямі шчасця, а таксама жартаўлівымі зычэннямі, у тым ліку і на тэмы студэнцкага жыцця. Персанажы свята – традыцыйныя: звяздар, каза, павадыр, механоша. Можна прадугледзець і дарэнне калядоўшчыкаў за добрую вестку і пажаданні – гэта, як правіла, «кусок пірага» і «каўбаса».

**«Гуканне вясны»**

Гэта апошняе ў навучальным годзе традыцыйнае свята.

Сакавік, хоць і вясновы месяц, але часта бывае вельмі халодным. Таму і гукалі вясну, каб наблізіць прыход цяпла. Выбіралі высокае месца за вёскай, на гары, залазілі на стрэхі гаспадарчых прыбудоў, якія пачыналі вызваляцца ад снегу, і спявалі:

Агу вясна, агу красна,
А што ж ты нам прынесла: У-у,
Старым бабкам па кіёчку, па кіёчку,
Маладзіцам па сыночку па сыночку,
А дзевачкам па вяночку, па вяночку,
Малым дзеткам па яечку, па яечку У-у [1, с. 122].

У вялікіх вёсках магло быць некалькі гуртоў, якія спявалі адначасова, падстройваючыся адзін пад аднаго. І хоць песні маюць пераважна заклінальны характар, яны ўражваюць канцэнтраваным апісаннем ладу сялянскага жыцця. Вобразы прыведзенай песні насычаны семантыкай вясны як пары года і вясны як перыяду чалавечага жыцця, суаднесенага з узростам. Так, кіёчак патрэбен старым бабкам, каб выходзіць на вуліцу: грэцца на сонцы, слухаць птушак, займацца вясновымі гаспадарчымі клопатамі. «Маладзіцам па сыночку» – універсальны вобраз вясны як перыяду абуджэння жыватворных сіл прыроды, актывізацыі творчых імпульсаў чалавека, часу нараджэння новых ідэй, жаданняў, часу пошукаў, спадзяванняў, веры і хараства. Семантыка вясны як нараджэння з’яўляецца першаснай і для прыроднага свету, і для чалавечага.

Хуткацечнасць жыцця запраграмавана самой прыродай, таму ўспрымалася нашымі продкамі як абсалютна заканамерная з’ява. Важна было кожны ўзроставы этап адпрацаваць па традыцыйнай праграме-схеме. Вобраз вяночка, які прыносіць вясна дзяўчатам – гэта рэалізацыя чарговага этапу; ён характарызуецца ўскладненнем сацыяльнага статуса: не проста дачка, а дзяўчына шлюбнага ўзросту. Вясновая песня-гуканне напаўняе чалавека энергіяй стварэння і актыўнага пошуку.

Важным атрыбутам «Гукання вясны» з’яўляецца печыва: з цеста выпякалі «птушачак» і, спяваючы, падкідвалі іх угору, імітуючы прылёт птушак. А паколькі гукалі вясну падчас Вялікага і самага строгага

посту, то і птушачак выпякалі з поснага цеста. Гэту акалічнасць можна мець на ўвазе пры арганізацыі сучаснага свята, каб глыбей зразумець традыцыі нашага народа, яго характар і прыярытэты. Усе магічныя дзеянні павінны былі паспрыяць надыходу цяпла, прылёту сапраўдных птушак і гарманізацыі чалавечага і прыроднага свету. Вобраз такога свету таксама створаны ў песнях:

Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла,
Каб сьнег белы растапіла,
Каб садзікі расквяціла. Гу-у [3].

Сучаснае «Гуканне вясны» варта праводзіць на вуліцы. У тэхналагічным універсітэце пляцоўкай для яго стаў высокі ганак навучальнай установы.

«Гуканне вясны» – старажытнае і семантычна складанае свята. Яно патрабуе грунтоўнай тэарэтычнай падрыхтоўкі: разумення сімволікі, арыентацыі ў гістарычных напластаваннях, ведання культурных сэнсаў. Галоўная ідэя свята – гэта абуджэнне жыццёвых, творчых, інтэлектуальных, эмацыянальных сіл чалавека. Для студэнцкай моладзі актуальнай становіцца праблема сталення і выбару пары. У сучасных умовах важна арыентаваць моладзь на прыярытэты маральна-этычных каштоўнасцей традыцыйнага грамадства. Менавіта яны ляжаць у аснове многіх веснавых карагодаў і гульняў. Адзін з найбольш распаўсюджаных на тэрыторыі Беларусі – карагод «А па возеру», сэнс якога – у выбары дзяўчат хлопцамі. Блізкае значэнне мае і абрадавая гульня «Царэўна – пусці ў горад» [6, с. 133].

У канву свята арганічна ўплятаюцца вершы і песні пра вясну. У працэсе святкавання гледачы паступова ўцягваюцца ў гульнёвыя карагоды, у змесце якіх дамінуюць раслінныя вобразы: «Бела бярозка» [1, с. 166], «Медуніца лугавая»[1, с. 164].

Вясна – час абуджэння зямлі, пара закладкі новага ўраджаю. Гэты этап таксама адлюстраваны ў гульнях, адной з якіх з’яўляецца гульня «Грушка»:

Да ўжо грушу пасадзілі,
А я, маладзенька, скачу-пляшу!
Да ўжо грушку пара палівацi,
А я, маладзенька, скачу-пляшу! [6, с. 155].

Нязменны атрыбут свята «Гуканне вясны» – птушкі-«жавароначкі». У традыцыйнай культуры імі ўпрыгожваюць дрэвы, каб прывабіць сапраўдных птушак – веступоў вясны.

На імправізаваным свяце на завяршэнне у неба выпускаюцца прымацаваныя да паветраных шароў папяровыя птушкі.

Такім чынам, намі распрацавана канцэпцыя адаптацыі народных святаў да гарадскога побыту і ўмоваў навучальнай установы. Так старадаўняя беларуская архаіка, у адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй, спалучаецца з сучаснасцю і навучальным працэсам.

Нашы святы нельга аднесці да традыцыйна фальклорных: гэта хутчэй тэатралізаванае дзейства, у якое ўплецены фальклорныя матывы.

Традыцыйныя святы – цудоўная магчымасць абудзіць і выкарыстаць творчы патэнцыял студэнтаў. Арганічным з'яўляецца прымеркаванне да свята «Багач» студэнцкай канферэнцыі з дакладамі па лепшых курсавых работах ці навуковых праектах, зробленых да канца папярэдняга навучальнага года. Да «Гукання вясны» тэмай творчых праектаў можа быць вясна і птушкі, экалагічная тэма. Сцэнарыі святаў могуць быць самыя разнастайныя. Багач, Каляды і Гуканне вясны павінны стаць кананічнымі агульнаўніверсітэцкімі святамі з адпаведнымі навуковымі, адукацыйнымі і выхаваўчымі напрамкамі.

Засваенне традыцыйнай культуры – адзін са спосабаў супрацьстаяння духоўнай дэградацыі моладзі, элемент пазітыўнай этнакультурнай ідэнтычнасці – фактара, ад якога залежыць не толькі псіхалагічны дабрабыт, але і агульнае здароўе беларускай нацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1 Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў і інш. – Мн.: Вышэйшая школа, 1996. – 856 с.
2. Вараб'ёва, В.А. Традыцыйнае свята «Багач» у вучэбна-выхаваўчым працэсе // В.А. Вараб'ёва // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук арт. – Вып. 7. – Мн.: РІВШ, 2010. – С. 313-320.
3. Веснавыя песні (Палессе). – [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://shkola.of.by/vesnaviya-pesni-palesse.html. – Дата доступу: 23.05.2016.
4. Гребень, Н.Ф. Роль культуры в обеспечении психологического благополучия белорусской нации / Н.Ф. Гребень. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф., 20-21 лістапада 2014 г., г. Мінск. – Мінск: Права і эканоміка, 2014. – С. 406-408.
5. Куруленко, Э.А. Антропологические основания культурного наследия. Диалог традиционного и современного / Э.А. Куруленко, В.И. Ионесов. // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф., 20-21 лістапада 2014 г., г. Мінск. – Мінск: Права і эканоміка, 2014. – С. 418-421.
6. Народны тэатр (Беларус. нар. творчасць); уклад., уступ, артыкул і камент. М.А. Каладзінскага. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 511 с.